Першапачаткова Л. называлі *жыціе* святога. Першы зб. лац. хрысціянскіх Л. «Залатая легенда» (13 ст.) перакладзены на многія мовы. Паступова назва пашырылася на ўсе маральна-павучальныя рэліг. апавяданні, якія фантаст. тлумачылі падзеі на падставе нар. рэліг., гіст., сац.-ўтапічных, этычных і інш. поглядаў. Самыя стараж. Л. касмаганічныя — пра стварэнне сусвету, Зямлі, Сонца, зорак і інш. У іх усё стварае Бог, дзейнічае д'ябал (запісы Е.Раманава, У.Дабравольскага, М.Федароўскага, А.Сержпутоўскага і інш.). Этыялагічныя Л. фантаст. тлумачаць паходжанне жывёльнага свету, тапанімічныя — узнікненне пэўных гарадоў, вёсак, рэк, азёр, урочышчаў і іх назваў («Аб рацэ Бярозе», «Свіслацкае возера»), этнаганічныя — паходжанне народаў, плямён і інш. Існавала шмат Л. пра вандраванні Хрыста, святых. Гіст. Л. апавядаюць пра важныя гіст. падзеі, вядомых асоб (вайну 1812, каралёў Саса, Панятоўскага, і інш.). Выкрыццё сац. несправядлівасці — асн. змест сац.-ўтапічных і быт. Л. Адзін з пашыраных сюжэтаў Л. — «Мадэй» (апубл. 43 польск., 8 рус., 6 бел. тэкстаў) — дараванне грахоў вял. грэшніку за забойства жорсткага прыганятага.

Літ. Л. часта грунтуюцца на фалькл. сюжэтах. Сюжэты, матывы і вобразы Л. выкарыстоўвалі Я.Купала («Сон на кургане», «Гусляр», «Магіла льва»), Я.Колас («Як Янка разбагацеў»), М.Багдановіч («Страцім-лебедзь»), У.Караткевіч («Чорны замак Альшанскі») і інш.

*Літ.:* Беларуская народна-паэтычная творчасць. Мінск, 1979; Легенды і паданні. Мінск, 1983; Пушчанскія скарбы: легенды і паданні. Мінск, 2009; Зямля сілы. Белавежская пушча. Мінск, 2009.

**ЛЕГЕНДА́РНЫЯ БАЛА́ДЫ**, апавядальныя песні, якія спалучаюць у сабе жанравыя прыкметы нар. балад і ўласна легенд. У бел. нар. рэпертуары да Л.б. адносяцца легенды: «Юр'я і Цмок», «Святая Дарота (Варвара)», «Дзеўка і Шатан», «Дзеўка-дзетагубніца», «Святая Алена». Бытуючы ў нар. асяроддзі, гэтыя творы захавалі драм. сюжэт, набылі казачнае адценне і рысы балад пра незвычайнае здарэнне. Так, у Л.б. «Юр'я і Цмок» перапрацавана хрысціянская легенда пра Георгія, пераможцу змея. Увага засяроджана на перажыванні за лёс царэўны, якую цар пасылае да Цмока, і яе цудоўным выратаванні. У баладзе пра Дароту (Варвару) канфлікт аповеду грунтуецца на адмаўленні дзяўчыны выйсці замуж за караля-цыгана (паводле легенды — караля-язычніка). Нягледзячы на ўчыненыя здзекі і катаванні, яна не толькі выжыла, але і стала яшчэ больш прыгожай: Хоць не ела, не піла // Пякней стала, як была! Напрыканцы твора высвятляецца, што паланянку «жывіў» сам Гасподзь Бог са святымі анёламі. У гэтым канфлікце прасочваецца супрацьстаянне хрысціянства і язычніцтва.

*Літ.:* Балады. Мінск, 1977. Кн. 1; С а л а в е й Л.М. Беларуская народная балада. Мінск, 1978. *А.М.Аляхновіч.*

**ЛЕДАГО́РАЎ** Ігар Вадзімавіч (9.5.1932, Масква — 10.2.2005), расійскі акцёр тэатра і кіно. Нар. артыст Расіі (1989). Скончыў ін-ты політэхн.



*І.В.Ледагораў.*

(1958) і тэатр.-маст. (1964) у Ташкенце. Працаваў у тэатрах Расіі. У бел. кіно стварыў запамінальны вобраз падпольшчыка Жана ў фільме «Руіны страляюць ва ўпор» (1970—72). Дзярж. прэмія Беларусі 1974. Дзярж. прэмія Расіі 1978.

**ЛЕ ДУ** (Le Doux) Франсуа Габрыэль (1755?, Парыж — 2.2.1823), танцоўшчык, балетмайстар, педагог. З 1770 саліст тэатра «Каралеўская акадэмія музыкі і танца» («Гранд-Апера») у Парыжы. У 1782—85 па запрашэнні падскарбія надворнага літоўскага А.Тызенгаўза працаваў балетмайстрам у яго прыдворным тэатры ў Гродне. Выкладаў у балетнай школе ў Паставах (працавала да 1794), дзе ў 1784 паставіў уласны «Балет вод, або Купель Дзіяны» і падрыхтаваў балет «Гілас і Сільвія». З 1785 у Польшчы.

**ЛЕ́ЙКА** Кандрат Тодаравіч (17.9.1860, в. Збочна Слонімскага р-на — 6.9.1921), беларускі пісьменнік. Скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю (1879). Настаўнічаў. Прозу Л. вызначае блізкасць да жыцця (апавяданні «Кульгавы дзядзька Раман» і «Таклюся-сухотніца», 1912; «Пан Трудоўскі», 1914). Творы вылучаюцца пранікнёным лірызмам («Успамін», 1911), дабрадушным гумарам («Абмылка», 1915). П'еса «Снатворны мак» (1912) на казачна-фантаст. сюжэт з раслiннага і жывёльнага свету — першая спроба ў бел. л-ры стварыць драм. твор для лялечнага тэатра.

*Літ.:* Ч ы г р ы н С. Пакінуў Кандрат Лейка // Маладосць. 2007. № 9; Беларускія байкі: зборнік. Мінск, 2011.

**ЛЕ́ЙКА**, прыстасаванне ў выглядзе конуса з вузкай трубкай для пералівання і фільтравання вадкасцей.

**ЛЕ́ЙТМАН** Леў Меeравіч (23.3.1896, г. Петрыкаў — 20.9.1974), беларускі графік, педагог. Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (1967). Вучыўся ў Віцебскай школе-майстэрні Ю.*Пэна.* Скончыў курсы павышэння кваліфікацыі пры Усерас. акадэміі мастацтваў у Ленінградзе (1937). Выкладаў у Віцебскім (1931—41) і Мінскім (1947—58) маст. вучылішчах. Працаваў пераважна ў тэхніцы акварэлі. Аўтар лірычных, тонкіх паводле колеру пейзажаў «Дажджлівы дзень. Дзвіна» (1934), «Вясна» (1939), «Зіма» (1942), «Чырвоныя дахі», «Вёска Серада» (абодва 1943), «Старадаўняя альтанка», «Цішыня» (абодва 1945), «Беларуская вясна» (1959), «Бярозкі» (1959), «Вячэрнія палі» (1960), краявідаў Мінска — «Мінская ўскраіна»

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ